Надзея Парчук

# Тваім радкам звінець – не адзвінець

*Да 90-годдзя Міхася Рудкоўскага*



Беларуская зямля багатая на таленавітых людзей, у тым ліку на паэтаў ды пісьменнікаў. І наша Берасцейшчына — таксама. На адной толькі Ганцаўшчыне лічыць — не пералічыць літаратурных зорак-знакамітасцей. Амаль кожная вёсачка, кожнае ганцавіцкае сяльцо маюць сваіх творцаў. Не засталася ўбаку і вёска з паэтычнай і распаўсюджанай на Палессі назвай — Востраў. Яна падарыла нам і ўсяму свету аднаго з самых яркіх і самабытных майстроў беларускага слова — Міхася Рудкоўскага, якому 17 красавіка 2026 г. споўнілася б 90 гадоў. На жаль, гэтага цудоўнага, таленавітага паэта і прыгожага, высакароднай душы чалавека ўжо няма сярод нас. 7 ліпеня 1991 года перастала біцца яго сэрца, у росквіце творчых сіл і высокіх чалавечых памкненняў сышоў ён ад нас, пакінуўшы багатую літаратурную спадчыну.

Першы зборнік М. Рудкоўскага пабачыў свет у 1963 годзе. Кніга так і называлася — «Першыя вёрсты». Яна адразу была заўважана як майстрамі слова, так і аматарамі паэзіі. Ці не таму сярод літаратараў ды сяброў паэта ўкаранілася думка, што Міхась Рудкоўскі прыйшоў у літаратуру ў пачатку 1960-ых гадоў. Калі выходзіць з часу з'яўлення зборніка-першынца, то яно так і ёсць. Аднак варта заўважыць, што яшчэ задоўга да выхаду кнігі ў Рудкоўскага былі публікацыі ў часопісе «Маладосць», газетах «Чырвоная змена», «Заря», а найперш — у ганцавіцкай «Сялянскай праўдзе» (пазней «Савецкае Палессе»), якая благаславіла паэта-пачаткоўца ў слаўную творчую дарогу, апублікаваўшы падборку ягоных вершаў («Успаміны», «Восень» і інш.). І было гэта ў 1958 годзе. Дарэчы, узначальваў тады рэдакцыю газеты вядомы журналіст, закаханы

ў наша Палессе краязнавец і пісьменнік Васіль Праскураў, які пазней стане літаратурным настаўнікам, дарадцам і верным сябрам таленавітаму палешуку (сам жа Васіль Фёдаравіч быў родам з Віцебшчыны).

Калі ж паглыбіцца больш сур'ёзна, то можна смела заключыць, што да прыгожай паненкі Паэзіі Міхась наблізіўся яшчэ раней. Бо перад тым, як адважыцца вынесці сваю творчасць, як кажуць, на суд чытачоў, яму спатрэбіўся час. Гэтае заключэнне ў сваіх успамінах пацвердзіла і малодшая сястра паэта Ірына Міхайлаўна: «Спробу складаць вершы будучы паэт зрабіў у чацвёртым класе. Некалькі вершаў былі надрукаваны на старонках газеты "Піянер Беларусі"».

Другі зборнік з адметнай і сімвалічнай для палескага краю назвай «Сінія Брады» (1967) Уладзімір Калеснік — таксама настаўнік і апякун Рудкоўскага — назаве «пашпартам мастацкай сталасці аўтара». Пасля яго выхаду быў прызнаны літаратурны прафесіяналізм і творчы дар паэта. Хутка Міхася Рудкоўскага прынялі ў Саюз пісьменнікаў СССР. Дарэчы, у той час ён быў першым прафесійным паэтам на Ганцаўшчыне і доўгі час (пасля сыходу з жыцця ў 1957 годзе Міколы Засіма) заставаўся адзіным членам Саюза пісьменнікаў СССР на Брэстчыне.

Наступныя свае зборнікі паэт таксама назваў на дзіва ўдала, ёмка і паэтычна: «Позвы» (1971), «У краі тым...» (1975), «Векавечная Бацькаўшчына» (1976), «Трыгор'е» (1981), «Засцярога» (1984), «Залатазвон» — аднатомнік выбранай лірыкі (1986), «Да пребудешь ты в мире всегда!» (1990 г., Масква, выдавецтва «Советский писатель», у перакладзе Сяргея Красікава). І апошні зборнік «Гарынь» выйшаў у 1992 годзе. Сігнальны яго экземпляр паэт яшчэ паспеў патрымаць у руках.

Паэзія... Далёка не кожнаму яна падуладная і не кожнаму зразумелая. Але Міхась Рудкоўскі — чалавек з іншай кагорты. Ён быў прыроджаным мастаком, узнёслым рамантыкам і нястомным, глыбакадумным творцам. Як сапраўдны паэт-лірык, ён умеў пісаць душой і сэрцам. Усе яго вершы — простыя, шчырыя, даступныя і адначасова — кранальныя да глыбіні душы, чуллівыя да слёз, тыя, што пранікаюць да самага сэрца. Паэт па-майстэрску ўмеў падабраць тое адзіна трапнае, трапяткое, шчымлівае слоўка, якое абавязкова ўскалыхне і ўзрушыць душу чуйнага чытача. Ён умеў намаляваць яркую, запамінальную, непаўторную карціну жыццёвай рэчаіснасці. Таму паэзія Міхася Рудкоўскага — прыцягальная, запамінальная, чыстая, празрыстая, бы крынічная вада ў яго родных Сініх Брадах, крылатая, як урачысты залатазвон над Востраўскім храмам падчас праваслаўнага свята.

У творчасці Рудкоўскага ясна прасочваецца і глыбокі роздум, і душэўная трывога, і сыноўняя заклапочанасць за будучы лёс сваёй Айчыны; шчодра праяўляецца вялікая любоў да свайго роднага куточка, мілага сэрцу краю, любай зямелькі, дзе ён нарадзіўся, узрос і стаў прадаўжальнікам свайго роду, прадаўжальнікам жыцця, каб у свой шчаслівы час павучальна прамовіць роднаму сыну:

Ўдыхаем поле, луг і лес.
А сонца ў росах грае, грае...
Глядзі, сынок, глядзі, Алесь:
Перад табою — родны краю.
Каб так яго ты палюбіў,
Як прадзед, дзед яго любілі,
Я за цябе б спакойны быў
Нат і ў магіле.

Вось дзе непадробны патрыятызм і шчырая любоў да свайго краю, мудрая філасофія жыцця, сапраўдная лірычная вобразнасць, высокія бацькоўскія пачуцці, якімі напоўнена душа паэта! У васьмі паэтычных радках — колькі ўсяго ўмясцілася! Проста дзіву даешся!

А якая мелодыка гукаў, якая ладнасць, паэтычнасць і прыгажосць падабраных слоў, якая дакладнасць апісання ляснога малюнку, колькі захаплення і гонару ў паэта за сваю непаўторную палескую глыбінку, яе адвечную красу ў наступным творы:

Жыву ў лясах глыбокіх і прасторных,
Пад клёнамі адвечнымі жыву.
Цярушыць поўнач пыл высаказорны,
На твар задумны мой, на галаву.

Усё тут проста, мудра, суразмерна.
Я свой тут, нібы клён, я свой, бы звер.
Тут у лясах я чую кожным нервам
Гармонію і рытм нябесных сфер.

Вось гэта і ёсць сапраўдная высокая паэзія! Яна, можаце быць упэўненыя, стваралася не толькі сэрцам і душой паэта, але і з дапамогай Сіл Нябесных.

Як сялянскі сын, як вясковец ад нараджэння, паэт быў закаханы ў маляўнічыя краявіды роднай вёсачкі, ганарыўся ёю, сніў яе, калі быў удалечыні, і прысвяціў ёй не адзін верш:

Ёсць Востраў у мяне. З нягод і скрух
Я да яго лячу, як да святыні:
Ён даў дыханне мне, і зрок, і імя...

Многія радкі Рудкоўскага гучаць, як крылатыя выслоўі: «Мінулае не вернеш, не паўторыш, // Як не паднімеш збітае травы...»

Што датычыць наступнага чатырохрадкоўя, дык гэта ўжо — бясцэнная знаходка, сапраўдная мастацкая жамчужына — перліна красамоўства і маральнасці сціплага мудраца:

Запомнілася гэта як святыня,
Як бацькі запавет: кім ты б ні стаў —
Адной рукой гайдай калыску сына,
Другой — магілу дзедаву папраў.

Так прамовіць удаецца далёка не кожнаму стваральніку мастацкага слова!

А вось як выказаўся Міхась Рудкоўскі пра родныя Ганцавічы, дзе ён у маладыя гады спасцігаў таямніцы літаратурнай працы:

Ёсць ціхі гарадок над рэчкай Цною
Сярод лясоў палескіх і балот...
Не знаю, што ў жыцці было б са мною,
Калі б яго на свеце не было.

Відаць, я б жыў, відаць бы, не загінуў,
Пісаў бы вершы, сена ў копы клаў, —
Ды толькі не такой была б Айчына
І песня незакончанай была.

Паэт, здаецца, ні пра што не забыў у сваіх вершах. Каларыт Пінска, у якім ён вучыўся ў педвучылішчы, роднага Брэста, дзе доўгі час жыў і працаваў рэдактарам літаратурна-драматычных і музычных праграм на абласной тэлестудыі, Ганцавіч, Давыд-Гарадка, Гарыні, цяністых белавежскіх бароў, Нарачанскага краю адлюстраваліся ў шматлікіх творах М. Рудкоўскага. Ёсць у яго вершы і пра сонечны Крым, пра Байдарскі перавал, Ленінград, пра апошнія хвіліны жыцця Архімеда, далёкія планеты. Але што б ні было прадметам мастацкага асэнсавання паэта, галоўная думка творцы была пра чалавека, яго духоўны свет, пра дабро і зло, заганы і хараство, пра сутнасць жыцця на зямлі.

Ці не таму яго творы перакладзены на англійскую, грузінскую, расійскую, украінскую мовы, а многія з іх пакладзены на музыку. У 2008 годзе разам з Міколам Пракаповічам і Алесем Каско, як адзін з аўтараў зборніка «Трохперсце», Міхась Рудкоўскі стаў лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя У. Калесніка Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта ў намінацыі «Паэзія» пасмяротна.

Адданасць і вернасць матчынаму слову дапамаглі М. Рудкоўскаму стаць адметным і яскравым сваёй творчай індывідуальнасцю аўтарам, знайсці шмат літаратурна-мастацкіх залацінак, стварыць нямала цудоўных вершаў, выдаць добры дзясятак кніг, напісаць шмат дакументальных нарысаў, рэцэнзій, публіцыстычных артыкулаў. А былі ж яшчэ і пераклады з рускай, украінскай і польскай моў. Паэт прысвяціў мноства вершаў любай Беларусі, роднай палескай старонцы, Берасцейшчыне, Белавежскай пушчы, працавітым і мужным людзям, дарагім сэрцу мясцінам.

Добры ўнёсак у літаратурную скарбонку паспеў зрабіць нястомны ганцавіцкі творца. Шчодра ўзбагаціўшы нацыянальную літаратуру, Міхась Рудкоўскі заслужыў, каб удзячныя нашчадкі помнілі яго імя, цанілі яго творчасць, вучыліся на ёй любіць сваю зямлю, мову, Радзіму і само жыццё.

І ў заключэнне — радкі, прысвечаныя юбіляру, з надзеяй, што самотная душа паэта пачуе іх у святым паднябессі:

Табе з нябёсаў зоркаю гарэць
І ўніз дадолу знічкай не апасці.
Тваім радкам звінець — не адзвінець:
Яны для нас падораны на шчасце.

Дык як такое ў песнях не апець,
Калі ты сам нам столькі іх пакінуў?!
Тваім радкам гучаць і зіхацець
Над мілаю і любаю Айчынай.

